2. Западная Русь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://zapadrus.su/ . –Дата доступа: 10.04.2016.
3. Кононенко, Б. И. Большой толковый словарь по культурологии /Б.И. Кононенко. – М.: Вече –2000, 2003. – 512 с.
4. Котович, Т.В. IFMC-2015: движение, время, ритм и проекция хореографического поиска / Т.В. Котович // Искусство и культура. – 2016. – №1 (21). – С. 3–15.
5. Философский энциклопедический словарь/Л. Ф. Ильичёв [и др.]. – М.: Сов. энцикл., 1983.– 840 с.

*Дар'я Мардань*

**СЕМАНТЫКА ВОБРАЗА БЕЛАРУСКАГА ПЕСНЯРА (НА ПРЫКЛАДЗЕ СПЕКТАКЛЯ «ПЯСНЯР» НАЦЫЯНАЛЬНАГА АКАДЭМІЧНАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА ІМЯ М. ГОРКАГА)**

*Пясняр сілай свайго паэтычнага таленту фарміруе нацыянальную самасвядомасць, увасабляе нацыянальную ідэю. Вобраз песняра ўвасоблены ў беларускай літаратуры, музыцы, сцэнічным мастацтве. Ідэя стварэння вобраза Песняра ажыццёўлена на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў спектаклі «Пясняр».*

*Daria Mardan*

**THE SEMANTICS OF THE IMAGE OF THE BELARUSIAN PIASNYAR (ON THE EXAMPLE OF THE PLAY "PIASNYAR" BY GORKY NATIONAL ACADEMIC DRAMA THEATRE)**

*By power of his poetic talent Piasnyar creates national consciousness, embodies the national idea. The image of Piasnyar embodied in the Belarusian literature, music, performing arts. It is also implemented at stage of the Maksim Gorky National Academic Drama Theater in the play "Piasnyar".*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле аднаго з галоўных ідэолагаў беларускага руху першай паловы XX ст. А. Луцкевіча, «...беларускае нацыянальнае адраджэнне пачынаецца з адраджэння мовы, – справядлівей: з развіцця народнае гутаркі ў мову літаратурную» [1, с. 223]. У кожнага народа ёсць песняры, пракокі, што сілай свайго паэтычнага таленту вызначаюць не толькі шляхі развіцця роднай мовы, літаратуры, культуры, але і фарміруюць нацыянальную самасвядомасць, увасабляюць нацыянальную ідэю, даючы мэту і сэнс існавання не аднаму пакаленню. Яны становяцца сімваламі свайго народа. Пясняр – выдатны народны паэт, вершы якога перакладаюцца на музыку, становяцца песнямі. Такімі для Беларусі з`яўляюцца ў літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, у музыцы – Уладзімір Мулявін і інш.

Погляды Янкі Купалы на мастацтва, яго разуменне ролі і прызначэння паэта вынікалі з ідэі служэння народу ў яго барацьбе за свабоду і шчасце. Як адзначае А. Майхровіч, Купала заўседы заставаўся – сацыяльна і светапоглядна – сынам свайго народа, «сынам беззямельнага, што марыў аб зямлі і волі для простага чалавека працы і ніколі не адступаў ад гэтага. Лепшыя купалаўскія творы – сведчанне непарыўнасці паэта з лёсам народа і сваёй краіны» [3, с. 96].

Сапраўды, паэту ўласціва не толькі ўсведамленне неабходнасці адлюстравання сацыяльна-вызваленчых і маральна-гуманістычных памкненняў народа, але і адчуванне адзінства, непарыўнай сувязі з народным асяроддзем, з якога ён прыйшоў у літаратуру, што сталася перадумовай фарміравання пачуцця асабістай адказнасці за лёс свайго народа, скіравання творчай дзейнасці на адраджэнне радзімы. Вобразы песняроў у творах Янкі Купалы набываюць сімвалічнае значэнне абуджальнікаў народа, іх «песні» і музыка аказваюць уздзеянне на людзей, «сеюць» у народзе новыя ідэі. У вершах знаходзім разважанні Купалы аб тым, якім павінен быць пясняр («Песняру-беларусу», «Свінапас і стрынатка», «Памяці Шаўчэнкі» і інш.). У вершы «Памяці Т. Шаўчэнкі» адзначаецца, што калі пясняр памірае, то яго песня жыве. Сінанімічнымі вобразу песняра ў нашаніўскай паэзіі Янкі Купалы з'яўляюцца вобразы музыкі (вершы «Жыў музыка Налім...», «Грай жа, музыка...»), гусляра (верш «Гусляр» і адпаведная назва паэтычнага зборніка, паэма «Курган»), дудара (верш «Дудар»), лірніка (верш «Жальцеся, грайкія струны...»), званара (верш «Песня званара») і інш [4, с. 2].

Значны ўклад у беларускую адраджэнскую літаратуру ўнёс Якуб Колас. У паэме «Новая зямля» (1911–1923) ён адлюстраваў вострыя сацыяльныя і нацыянальныя супярэчнасці канца XIX – пачатку XX ст., духоўнае хараство і маральную веліч чалавека працы, яго адвечную мару «выбіцца ў людзі», быць гаспадаром на ўласнай зямлі. Паэт маляўніча паказаў побыт беларускага селяніна, стан народнай адукацыі. У паэме «Сымон-музыка» (1911–1925) паэт намаляваў вобраз маладога беларуса – свядомага тварца свайго лёсу, які рыхтуе сябе да працы па духоўным адраджэнні «забытага краю». У ролі Песняра ў гэтай паэме паўстае Сымон. Паэт выказвае канцэпцыю своеасаблівага нацыянальнага шляху беларусаў, якім выпала жыць на скрыжаванні розных культур, рэлігійных канфесій, геапалітычных памкненняў.

З дзейнасцю М. Багдановіча звязана ідэйна-эстэтычнае і жанравае ўзбагачэнне нацыянальнай літаратуры. Максім Багдановіч не толькі распрацоўваў і творча выкарыстоўваў беларускія нацыянальныя фальклорныя і літаратурныя традыцыі, даказваў бясспрэчнасць эстэтычных магчымасцей роднай мовы, але імкнуўся максімальна ўзбагаціць іх здабыткамі іншых народаў. Адным з першых паэт ўзбагачаў нацыянальную

літаратуру новымі для яе вершаванымі формамі і тэматычнымі накірункамі, перакладаў на беларускую мову творы класікаў сусветнай літаратуры.

Уладзімір Мулявін з ансамблем «Песняры» ў свой час вярнулі ўвагу беларускай музыкі да вытокаў, да фальклору, да культуры беларускага этнасу. Асоба Уладзіміра Мулявіна пацвярджае таксама дзіўную тэндэнцэю: сапраўднымі патрыётамі беларускага краю часта становяцца якраз прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Ідэя агульнага вобраза Песняра была ажыццяўлена на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў спектакле «Пясняр». Негледзячы на прысвячэнне «Заснавальніку і нязменнаму кіраўніку ансамбля «Песняры» Уладзіміру Мулявіну». Аповед не толькі пра Уладзіміра Мулявіна – пра лёс Бацькаўшчыны, лёсы іншых творцаў, найперш беларускіх песняроў. Таму на сцэне разам з Песняром, ролю якога выконвае Сяргей Жбанкоў, з'яўляюцца Янка Купала (Аляксандр Ждановіч), Якуб Колас (Андрэй Захарэвіч), Максім Багдановіч (Іван Стральцоў) і Цётка (Анастасія Шпакоўская). У спектаклі ёсць і прамыя паралелі з фактамі біяграфіі ўраджэнца Свярдлоўска, рускага па нацыянальнасці, які з 1963 года жыў у Беларусі і вельмі шмат зрабіў для пашырэння ў свеце беларускай песні, найперш фальклорнай спадчыны. Аднак стваральнікі спектакля ўзнімаюцца над фактамі да высокіх абагульненняў. Стасункі народа і песняра, творцы і музы, зберажэнне духоўнай спадчыны, любоў высокая і цынічная «гульня ў любоў» да «сінявокай Беларусі» (моцны вобраз Чорнага стварае Сяргей Чэкерэс), пакуты ад укрыжавання душы творцы паміж зямнымі рэаліямі ды ягоным памкненнем да нябесных ідэалаў. Тонкія адценні ідэй, светапоглядаў пранізваюць жывую, насычаную цудоўнай музыкай і спевамі тканіну нацыянальнага па духу і змесце спектакля.

**Спіс літаратуры:**

1. На шляху станаўлення беларускай нацыі : гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.] ; навук. рэд. В. В. Яноўская ; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 311 с.
2. Янка Купала [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.yankakupala.ru. – Дата доступа : 17.04.2016.
3. Майхрович, А. С. Идеал – свобода. Янка Купала / А. С. Майхрович // Белорусские революционные демократы. Важнейшие аспекты мировоззрения / А. С. Майхрович ; под ред. Н. С. Купчина [и др.]. – Минск, 1977. – 231 с.
4. Мятліцкая, Г. Універсальныя вобразы-сімвалы ў паэзіі Янкі Купалы нашаніўскага перыяду [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.elib.bsu.by/bitstream. – Дата доступу : 17.04.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ